# 2025 г. – 120 гадоў з пачатку падзей Першай рускай рэвалюцыі на Кобрыншчыне (1905–1907)



У гісторыі Беларусі 1905 год стаў годам значных узрушэнняў і змен, звязаных з падзеямі Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў. Рэвалюцыйны рух, які ахапіў краіну, знайшоў водгук і на Кобрыншчыне.

Адносная блізкасць горада ад старой руска-германскай мяжы змушала да пастаяннай пільнасці. З аглядкай на гэту блізкасць мяжы з Усходняй Прусіяй рускі ўрад трымаў на заходніх ускраінах імперыі значныя воінскія сілы. Таму здаўна ў Кобрыне кватаравалі 149-ы Таманскі і 150-ы Чарнаморскі пяхотныя палкі. Царская адміністрацыя надавала гораду пэўнае ваеннае значэнне, ператварыўшы яго ў буйны мабілізацыйны пункт. У час руска-японскай вайны (1904-1905) у Кобрыне фарміравалася значная колькасць часцей, якія потым адпраўляліся ў Маньчжурыю. З усяго Кобрынскага павета, які ўваходзіў у склад Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, збіралася папаўненне навабранцаў для дзеючай арміі.

У 1905–1907 гадах Кобрынскі павет ахапіў магутны рэвалюцыйны рух. Узрушыла жыхароў Кобрыншчыны крывавая расправа 9 студзеня 1905 года ў Пецярбургу, дзе войскі разагналі мірнае шэсце працоўных, прымянілі агнястрэльную зброю, загінулі больш сотні чалавек. На кобрынскіх вуліцах з’явіліся першыя дэманстрацыі пратэсту. Да масавых выступленняў супраць манархіі кабрынчан падштурхнулі многія фактары, у т. л. спад прамысловасці, неўраджай, зніжэнне ўзроўню жыцця.

Летам 1905 года пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Расіі сярод чарговай партыі прызыўнікоў успыхнулі хваляванні, якія суправаджаліся адмовай адпраўляцца на бойню. Мабілізаваныя запалілі гандлёвыя рады, пажар хутка распаўсюдзіўся на ўвесь горад. Згарэлі цэнтр і ўся Пінская (сёння Першамайская) вуліца. Хваляванні працягваліся і ў час другога набору прызыўнікоў у армію, калі вялікі натоўп моладзі з чырвонымі сцягамі, з песнямі прыйшоў граміць паліцэйскі ўчастак.

17 кастрычніка 1905 года, калі выйшаў царскі маніфест, Кобрын зноў быў ахоплены дэманстрацыямі. У адказ на

абяцанне ўяўных свабод людзі выйшлі з чырвонымі сцягамі і лозунгамі «Далоў самадзяржаўе!». Па Ратненскай вуліцы дэманстранты рушылі да «Губерні», спадзяючыся на падтрымку прызыўнікоў. Але тут іх ужо чакалі казакі, якія пусцілі ў ход нагайкі і шашкі.

Асабліва арганізавана выступілі кобрынскія чыгуначнікі. У пачатку лістапада 1905 года на станцыі Кобрын быў створаны Кобрынскі камітэт Усерасійскага чыгуначнага саюза, які кіраваў агітацыяй, мітынгамі, забастоўкамі. У склад камітэта, абранага мясцовымі рабочымі, увайшлі К. А. Кандрацьеў (старшыня), Я. М. Скаркоўскі, І. А. Грышко, Я. К. Гаазе, Н. Багатко. Пад кіраўніцтвам камітэта чыгуначнікі станцыі «Кобрын» і майстэрняў правялі некалькі буйных забастовак у падтрымку маскоўскага пралетарыяту, дабіліся зняцця начальніка станцыі і іншых службовых асоб і ўзялі станцыю пад свой кантроль. Чыгуначнікі арганізавалі баявую дружыну, якая ўзброілася жалезнымі пікамі, выробленымі тут жа, у майстэрні. Камітэтчыкі праводзілі мітынгі, на якіх выстаўляліся палітычныя патрабаванні, наладжвалі цесную сувязь з іншымі забастовачнымі камітэтамі.

Як даносіў у Віленскую судовую палату пракурор Гродзенскага акруговага суда, камітэт ставіў перад сабой «не толькі эканамічныя, але і палітычныя мэты, накіроўваў сваю дзейнасць да звяржэння існуючага ў Расіі дзяржаўнага і грамадскага ладу». У кастрычніку 1905 года кобрынскія чыгуначнікі дружна ўключыліся ў агульнарасійскую забастоўку чыгуначнікаў. Яе на Палескіх чыгунках у хуткім часе падтрымалі і паштова-тэлеграфныя служачыя Кобрына, потым настаўнікі гарадскіх вучылішчаў і сельскіх школ. Баставалі і многія дробныя прадпрыемствы горада.

12 снежня 1905 года, калі ў Маскве разгортваліся баі, з Гродна на адрас віленскага генерал-губернатара паляцела трывожная тэлеграма: «...з прычыны забастоўкі палескіх чыгуначнікаў Кобрынскі павет зусім адрэзаны ў сэнсе шляхоў зносін». Гэта азначала, што карнікі не могуць дабрацца да мяцежнага горада і патрабуюцца тэрміновыя меры. Праз два дні ў адносінах да павета было выкарыстана «Палажэнне аб узмоцненай ахове» тэрмінам на адзін год. Атрымаўшы поўную свабоду дзеянняў для падаўлення ўсіх іншадумцаў, паліцэйскія ўлады Кобрына жорстка расправіліся з удзельнікамі мітынгу.

На падзеі ў Кобрыне адгукнуліся жыхары вёсак, якія выступалі супраць памешчыкаў, падпальвалі іх маёнткі. Памешчыкі жорстка распраўляліся з сялянамі, але яны не здаваліся. Хваля народнага гневу расла, паўстанні ўспыхвалі адно за другім. У 1905—1906 гадах у Кобрынскім павеце адбылося каля 200 адкрытых выступленняў, некаторыя з іх выліліся ва ўзброеныя сутычкі. Найбольшую вядомасць атрымалі падзеі ў Ілаўскай воласці, дзе жыхары некалькіх вёсак вялі барацьбу з памешчыкам Шэметам і яго гайдукамі. На чале сялян стаялі К. Рачко і М. Нічыпарук, якія і распрацавалі план дзеянняў. Паўстанцы ўзброіліся драбавікамі, віламі і самаробнымі пікамі, прыхапілі некалькі бутляў газы і накіраваліся ў бок маёнтка. Але памешчык ужо паспеў выклікаць роту салдат, і выступленне было задушана.

Звесткі пра справы на Кобрыншчыне дайшлі да цара, які загадаў тэрмін дзеяння ўведзенага ў Пружанскім і Кобрынскім паветах «Палажэння аб узмоцненай ахове» прадоўжыць да 8 снежня 1908 года. Вынікам неабмежаваных карных паўнамоцтваў быў арышт у пачатку студзеня 1906 года камітэта Кобрынскага аддзялення чыгуначнага саюза. Палескія чыгункі адны з апошніх закончылі стачку. Усе члены камітэта былі арыштаваны і аддадзены суду. З'яўляючыся авангардам узнікшага ў той час на Кобрыншчыне рабочага класа, чыгуначнікі аднымі з першых выступілі на арганізаваную барацьбу з самадзяржаўем.

У памяць аб рэвалюцыйнай барацьбе кобрынскіх чыгуначнікаў на будынку чыгуначнага вакзала ў 1976 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава захоўваецца арыгінал жандармскага данясення аб удзеле рабочых станцыі Кобрын ва Усерасійскай забастоўцы. Пацвярджае гэта і тэлеграма Віленскага генерал-губернатара аб аб'яўленні Кобрынскага павета ў стане ўзмоцненай аховы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай
цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат.
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Філякоў, У. Г**. Рэвалюцыя 1905–07 у Расіі / У. Г. Філякоў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2001. - Т. 13. - С. 542–543.

**Филяков, В. Г.** Революция 1905–07 / В. Г. Филяков // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 413–414.

**Філякоў, У**. Рэвалюцыя 1905–07 / Уладзімір Філякоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 164–165.

**Большевики** Белоруссии в Первой русской революции. – Москва : Госполитиздат, 1955. – 132 с.

См. на с. 94, 108, 121 [Кобринский уезд].

**Король, А. С.** Большевики Белоруссии в революции 1905–1907 годов / А. С. Король. – Минск : Беларусь, 1986. – 192 с.

**Пліско, Н. М.** 1905 год на Кобрыншчыне / Н. М. Пліско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-даккументальня хроніка. – Мінск, 2002. – С. 71-74.

**Плиско, Н. М.** Кобрин : историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск : Полымя, 1987. – 94, [2] с. – (Города Белоруссии).

См. на с. 37–43.

**Революционное** движение Белоруссии 1905-1907 гг. : документы и материалы. - Минск, 1955.

**Савицкий, Э. М.** Мемориальная доска в память о революционных выступлениях железнодорожников в 1905 г. / Э. М. Савицкий // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. – Минск, 1990. – С. 248.

**Савіцкі, Э. М.** Месца выступленняў чыгуначнікаў у 1905 г. / Э. М. Савіцкі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 224.

**Елизарова, Ж.** Всегда на страже. Таямніцы зямлі кобрынскай / подготовила Жанна Елизарова ; по материалам интернет-порталов "Познай Кобрин", "RETRO-КОБРИН-CITY", библиотеки УК "Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова" // Кобрынскі веснік. - 2022. — 12 сакавіка (№ 18). — С. 4, 9 : фот.

О военных событиях на территории Кобринщины.

**Чирун, А**. 1905 год на Кобринщине как один из предвестников Великого Октября / Александр Чирун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 5 лістапада (№ 85). — С. 9 : фот.

О революционных событиях на Кобринщине 1905—1907 гг.

**Мартынов, А.** На переломе веков / А. Мартынов // Кобрин-информ. - 2009. - 11 июня. - С. 26.

Кобрин в начале XX века.

**Китайчук, М.** Бурные годы начала века / М. Китайчук // Кобрин-информ. – 2006. – 2 ноября. – С. 8.

Первая русская революция.

**Савченко, Н.** Революционный Октябрь. 88 лет назад / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. - 2005. - 5 лістапада. С. 1–2.

О революционных событиях в Кобрине в 1905 г. и позднее.

**Мартынов, А**. Старые казармы : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1996. – 21 жніўня.

В Кобрине с давних пор постоянно находился воинский гарнизон, в т. ч. в начале XX в. - два пехотных полка – 149-й Черноморский и 150-й Таманский.

**Мартынаў, А.** Войны ў гісторыі нашага горада / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 26 лютага, 7 сакавіка, 10 сакавіка**.**

**Мартынов, А**. Бунтари свободы / А. Мартынов // Заря. – 1986. – 26 сентября.

События Первой русской революции на Кобринщине.

**Малашевский, В.** История одной телеграммы / В. Малашевский // Заря. - 1981. - 24 января.

**Сідарук, П. С.** Горад Кобрын : [у 1905-1939 гг.] / П. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1980. – 13 мая.

**Сідарук, П. С.** I паднялася хваля гневу / П. С. Сідарук, I. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1980. – 8 ліпеня.

1905 год у Кобрыне і Кобрынскім павеце.

**Мартынаў, А.** Рэха рэвалюцыі ў Кобрыне : да 70-годдзя Першай рускай рэвалюцыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1975. – 4 снежня. – С. 4.

**Сідарук, I.** Загаралася зара свабоды / I. Сідарук // Камуністычная праца. Кобрын, 1975. - 5 красавіка.

Першая руская рэвалюцыя.

**Сідарук, П.** Гартаваліся ў барацьбе / П. Сідарук // Камуністычная праца. Кобрын, 1973. - 28 ліпеня.

Першая руская рэвалюцыя.

**Мартынаў, А**. Кобрынскія чыгуначнікі ў рэвалюцыі 1905 года / А. Мартынаў // Камуністычная праца. Кобрын, 1971. - 30 лістапада.

*Рэгіён:*

Кобрынскі раён

Кобрын

*Падзеі:*

Рэвалюцыя 1905–1907

*Прадметы:*

Рэвалюцыі